КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

# Вызваленне палітзняволеных без новых ахвяр

Рэзалюцыя дэмарктычных сілаў Беларусі да Канферэнцыі Новая Беларусь 2025

На чэрвень 2025 года ў беларускіх турмах утрымліваюцца не менш за 1180 палітычных зняволеныхі. Гэта не проста лічбы — гэта гісторыі людзей, якія трапілі ў няволю за свае перакананні, словы ці мірную дзейнасць. Паводле праваабаронцаў і сведчанняў былых зняволеных, умовы ўтрымання зняволеных нясуць прамую пагрозу іх жыццю і здароўю: адсутнасць медычнай дапамогі, поўная ізаляцыя ад родных і адвакатаў, адвольнае прадаўжэнне тэрмінаў.

У 2024 годзе быў пачаты працэс памілавання, у выніку якога 316 чалавек былі вызвалены. Мы вітаем гэты крок і лічым яго неабходным пачаткам. Але на кожнага вызваленага прыпадаюць дзясяткі новых арыштаў. Толькі за першае паўгоддзе 2025 года ў Беларусі было зафіксавана каля 1700 новых палітычных затрыманняў.

Такі падыход усё больш нагадвае практыку “выкупу зняволеных” у ГДР (Häftlingsfreikauf), дзе палітычных зняволеных вызвалялі за грошы ці тавары, адначасова узмацняючы маштабы рэпрэсій. У выніку ў турмах ГДР пабывала больш за 200 тысяч палітычных зняволеных. Гэта не гуманізм, а палітычны гандаль людзьмі.

Мы выступаем за вызваленне палітычных зняволеных, але не цаной новых ахвяр.
Наш заклік да ўладаў Беларусі:

- спыніць палітычныя рэпрэсіі і пераслед грамадзян і грамадзянак за іх погляды;
- спыніць катаванні і бесчалавечнае абыходжанне з палітычна зняволенымі;
- забяспечыць адвакатам і адвакаткам бесперашкодны і пастаянны доступ да сваіх кліентаў і кліентак;
- спыніць практыку запалохвання адвакатаў і адвакатак, каб яны маглі эфектыўна выконваць сваю функцыю па абароне зняволеных;
- скасаваць практыкі гвалтоўных дэпартацый і юрыдычна неаформленых вызваленняў, якія пакідаюць людзей ў нявызначаным нацыянальным прававым статусе;
- забяспечыць доступ міжнародных місій і назіральнікаў і назіральніц да месцаў зняволення;
- пачаць сапраўдны працэс вызвалення і поўнай рэабілітацыі ўсіх зняволеных па палітычных матывах.

Мы звяртаемся да дэмакратычных дзяржаў, міжнародных арганізацый і гуманітарных ініцыятыў з заклікам:

- выкарыстоўваць усе магчымыя дыпламатычныя і гуманітарныя механізмы, каб дамагчыся поўнага і безумоўнага вызвалення ўсіх палітычных зняволеных;
- не саступаць у пытаннях прынцыпаў: не дапускаць сцэнарыя, пры якім вызваленне адных замяняецца зняволеннем іншых;
- падтрымліваць тых, хто змагаецца за свабоду у Беларусі і па-за яе межамі.

Вызваленне палітычных зняволеных павінна стаць пачаткам спынення рэпрэсій, а не часткай палітычнага гандлю. Каб сапраўды абараніць чалавечую годнасць і спыніць цыкл гвалту, неабходна не толькі вызваляць тых, хто за кратамі, але і спыніць саму сістэму палітычнага пераследу.

*Канферэнцыя "Новая Беларусь" — жнівень 2025*